БЕЛАРУС

Выдае Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне у ЗША
Published by Byelorussian - American Association, Inc.
Address — Адрыс: Byelorussian-American Association, Inc.
405 Belmont Avenue, Brooklyn 7, N. Y., U. S. A.
Падпіска на год $ 2.50 — Subscription per year — $ 2.50
Рэдагуе Рэдакцыйная Калегія

PRICE 10 ¢ ЧАСАПІС БЕЛАРУСАУ У З. Г. А. BYELARUS — BYELORUSSIAN NEWSPAPER IN THE USA 10 ЦЭНТАЎ

Год III. № 9 (15) 23 Жніўня 1952 г. NEW YORK, N. Y., U. S .A. August 23, 1952 Vol. III. № 9 (15)

Палітычныя падзеі у сьвеце

ПЭКІН І МАСКВА ПАГРАЖАЮЦЬ ЗАДЗІНОЧАНЫМ НАЦЫЯМ

АМЭРЫКА

У выніку канфэрэнцыі дзяржаўнага сакратара Эчысона з міністрамі замежных справаў Аўстраліі й Новай Зэляндыі ў справе палажэньня на ўсходзе, якому пагражае савецкая агрэсія, у Вашынгтоне арганізаваная адмысловая Рада з прадстаўнікоў замежных міністэрстваў успомненых гаспадарстваў.

КАРЭЯ

Перамовы аб замірэньні й далей — ані з месца. Яны вядуцца ўжо з тыднёвымі перапынкамі. Тымчасам Пэкін і Масква ўсё вайстрэй пагражаюць Злучаным Нацыям. Пэкінская прэса дзень у дзень крычыць, што Паўночная Карэя ды Кітай у дрыз разаб'юць амэрыканскіх „агрэсараў", а пэкінскі урад хваліцца, што ваенная моц Паўночнае Карэі й Кітаю гэткая вялікая, што яны дадуць сабе рады і з Амэрыкай і з рэштай саюзьнікаў бяз асаблівых цяжкасьцяў, тым балей, што й дапамога Саветаў — пэўная. Пэкін дадае, што абарона Паўночнае Карэі адначасна й абарона незалежнасьці Кітаю.

У сувязі з гэтым Кім Ір Сэн, шэф чырвонае дэлегацыі, зрабіў прапанову замірыцца „без пераможцаў і пераможаных", абы толькі ...усе ваеннапалонныя былі рэпатрыяваныя".

Тымчасам, саюзнае лятунства працягвае бамбардаваньне стратэгічных пунктаў, ваенных складаў, фабрыкаў і транспартных калёнаў у Паўночнай Карэі. На працягу двох апошніх тыдняў зьбіта звыш 30 савецкіх МІГаў ды яшчэ больш пашкоджана. Цікава, між іншым, то саюзнае камандваньне паведамляе наперад насельніцтва тых ці іншых местаў ці пунктаў аб дакладным часе плянаванага бамбардаваньня, чым моцна кампрамітуе чырвонае камандваньне. На некаторых адрэзках сярэдняга фронту йдуць вельмі жорсткія баі за панаваньне над тым ці іншым стратэгічным пунктам з пераменнаю ўдачаю.

МАСКВА

У Маскву прыбыла дэлегацыя з Пэкіну на чале із старшынёю Савету Міністраў і Міністрам Нутраных Справаў Чжоў-Эн-Лаем. Дэлегацыю спаткалі на аэрадроме Молатаў і Вышынскі. У той самы дзень пачаліся нарады, што трываюць ужо на працягу колькіх дзён. Кітайскія дыпляматы прыбылі ў Маскву з мэтаю пераканаць савецкі ўрад у павялічэньні дапамогі чырвонаму Кітаю. Склад пэкінскае дэлегацыі сьветчыць аб тым, што маскоўскія перамовы будуць абмяркоўваць, галоўным чынам, ваенныя й ваенна-эканамічныя пытаньні. Як ведама заходнім гаспадарствам, чырвоны Кітай вельмі незадаволены з таго, што Саветы не даюць яму тае дапамогі, якая была яму абяцаная. Дэлегацыя мае якраз і дамагчыся ад Савецкага Ураду неадкладна павялічыць высылку зброі і самалётаў у Чырвоны Кітай.

ФРАНЦЫЯ

Паводле паведамленьняў з Парыжу, 13 верасьня маюць быць праведзеныя вялікія манэўры флёту НЭІТО ў Балтыцкім моры. Камандваць манэўрамі меўся амэрыканскі адмірал Мэк Кормік. Але таму, што Саветы назвалі гэтыя манэўры вялікай „правакацыяй", якая можа мець вельмі прыкрыя вынікі, амэрыканскія ваенныя караблі быццам, ня возьмуць удзелу ў гэтых манэўрах.

Камісія Замежных Справаў францускага Нацыянальнага Канвэнту вельмі незадаволеная дзейнасьцю францускага міністра замежных справаў Шумана і патрабуе ягонага звальненьня з пасады. Прычыны — недастатковa „наважаная" пастава Шумана адносна туніскіх нацыяналістых, пытаньня аб задзіночаньні сталёвае й вугольнае прамысловасьці Заходняе Эўропы, а таксама ў справе пратэктарату Францыі у Паўночнай Афрыцы.

НЯМЕЧЧЫНА

З Бону падаюць вестку аб расколе сярод буйнейшае сяньня нацыскае групы Заходняе Нямеччыны. Прычынай гэтага — палітыка набліжэньня ў дачыненьні да камуністых, якую праводзіць цэнтральны камітэт партыі. Само існаваньне нацыскае партыі — стаіць пад пагрозай, бо вярхоўны суд Заходняе Нямеччыны мае намер абвесьціць яе нелегальнай.

ІНДЫЯ

Ведамы сваеасаблівы дэмакрат Нэгру пачаў крыху непакоіцца. Ён зажадаў ад парляманту паўнамоцтваў аж да 1954 году арыштоўваць і, ня судзячы, караць усіх ворагаў дзяржавы. Супроць гэтага патрабаваньня вельмі войстра выступілі камуністыя. Іхны лідар Сандурайя адкрыта заявіў, што яны ня будуць зьвяртаць увагі на паліцыю, а самы будуць, калі прыйдзе час, арыштоўваць абшарнікаў ды капіталістых і расстрэльваць іх. Гэтая нахабная пагроза, аднак, нікога не запалохала й заканапраэкт быў прыняты значнаю бальшынёю галасоў, бо 101 проці 23-х.

„НЯВЕДАМАЯ" БЕЛАРУСЬ

Цікавую для нас рэч падае Б. Двинов у шостым сваім артыкуле аб савецка-амэрыканскіх дачыненьнях. Ён піша, што былы амэрыканскі пасол у Маскве Дэйвіс у сваім дакладзе ў Вашынгтон у 1939 годзе гаворыць, між іншага, аб магчымасьці нутраных забурэньняў у СССР, у выніку якіх могуць ад яго аддзяліцца гэткія гаспадарствы, як БЕЛАРУСЬ, Украіна, Усходні Каўказ, Манголія ды ін. Як бачым, нашая Беларусь ужо даўно ведамая дзяржаўнаму дэпартаманту ў Вашынгтоне, няведамая толькі... расейскім „дэмакратам". Але ведама, калі хто канечне хоча, — дык патрапіць і слана не заўважыць!

ЧАМУ НЯ ПЕРШЫЯ?

Бальшавікі ня кідаюць абурацца на „несправядлівыя" вынікі сёлетняе спартовае Алімпіяды. Блізу штодня на працягу апошніх тыдняў на балонках савецкае прэсы ізноў ды йзноў робяцца падлікі, перагляды вынікаў, лічацца пункты і... лаяцца заходнія спартоўцы, ці дакладней — спартовыя судзьдзі, што „за даляры" зрабілі пераможцамі „капіталістых" Амэрыкі, а не Савецкі Саюз, як гэта належылася. Праўда, усе гэтыя абурэньні бальшавікоў ня маюць сэнсу, аднак пятнаццатая спартовая Алімпіяда, што была адчыненая 19 ліпеня ў Фінляндыі, вартая, каб аб ёй успомніць. У ёй прыймалі удзел сотні спартоўцаў з усіх краінаў сьвету, бо ў спартыўным спаборніцтве зьнікаюць усе палітычныя ды расавыя розьніцы.

Сёлетняя Алімпіяда была цікавая якраз яшчэ й тым, што ў ёй упяршыню бралі ўдзел савецкія спартоўцы. Пераможцамі выйшлі амэрыканцы, чаго якраз ня могуць даравацьім іхнія камуністычная калегі. Амэрыканскія спартоўцы атрымалі 31 залатую мэдаль, здабыўшы 610 пунктаў, тады як савецкія —атрымалі 24 залатыя мэдалі й здабылі 553 пункты.

Тое, што ЗША апынуліся на першым месцы, — гэта ашуканства „імпэрыялістых", піша савецкая прэса. Першае месца павінна належыць самай „перадавой", самай „дэмакратычнай" і г. д. краіне, а не імпэрыялістым, што цаною даляра й розных ашуканстваў дасталіся на першае месца. Ня гледзячы на гэткія абурэньні савецкае прэсы, камуністычныя спартоўцы ўсёткі паведамілі аб сваёй згодзе прыняць удзел у наступнай алімпіядзе, што мае адбыцца ў 1956 годзе ў Мэльбурне у Аўстраліі.

Між іншага, вагонь, прынесены згодна із алімпійскаю традыцыяй з Алімпу ў Грэцыі, быў згашаны. Алімпійскі сьцяг быў перадазы мэру места Гэльсінкі фон Фрэнкелю. Новым прэзыдэнтам Алімпійскага Камітэту выбраны амэрыканец Брэнджэйк.

Дарагая цана

Перамовы ў Панмуджоме, што цягнуцца вось ужо другі год, ізноў, і гэтым разам, здаецца, канчальна, сутыкнуліся з вялікаю перашкодаю — справай прымусовае рэпатрыяцыі чырвоных ваеннапалонных, вялікая частка якіх із жахам адмаўляецца вярнуцца ў свае камуністычныя радзімы.

Амэрыканцы, навучаныя дазнаньнем 1945-47 гадоў, станоўка сяньня адмаўляюцца сілком аддаць камуністым іхных грамадзянаў. І відаць, дазнаньне гэтае ўсьцяж яшчэ войстрае й балючае ў іхнай памяці, калі амэрыканская дэлегацыя ня хоча йсьці ані на якія далейшыя палёгкі камуністым у гэтай справе.

Ці-ж дзіва? Варта толькі самым нам, што перажылі гэтыя жахлівыя дні й ночы мінулых трагічных год, успомніць і савецкіх агентаў, што свабодна раз'яжджалі тады па лягерох ДП, палюючы на нашыя душы, і прымусовыя вывазы да хаты на сьмерць напалоханых людзей, і нязьлічоныя скрынінгі, і ўцёкі, хаваньне па лясох, роспач, самагубствы...

Паводле афіцыйнае статыстыкі больш двух мільёнаў б. савецкіх грамадзянаў і вайсковых былі тады прымусова адпраўленыя на пэўныя пакуты й жахлівую сьмерць. Шмат хто з нешчасьліўцаў, згары ведаючы аб лёсе, які іх чакаў за чырвонай мяжой, што так неспадзявана знайшлася тут-жа, блізу пад бокам, — скончылі жыцьцё самагубствам, пераразаючы жылы на рукох і горлы брытвамі, кідаючыся ў вагонь падпаленых баракаў. Усё гэтае рабілася часта-густа на вачох саюзных, найчасьцей амэрыканскіх жаўнераў, якія із дзіўным супакоем назіралі за гэтымі жудаснымі сцэнамі, не сьпяшаючыся фатаграфуючы сцэны, ад якіх кроў стыгла ў жылах. Праўда, здараліся выпадкі, калі амэрыканскае камандваньне выбараньвала людзей, але выпадкі гэтыя былі гэткія радкія, што назвы Дахаў, Фюссэн, Ліенц ды шмат, шмат іншых назаўсёды ўжо, хіба, застануцца ў нашай памяці.

„Выдача" былых савецкіх грамадзянаў Саветам цягнулася ад травеню 1945, калі адыйшлі „на родіну" першыя ўпрыгожаныя чырвонымі сьцягамі транспарты, аж да сярэдзіны 1947 году, калі былі вывезеныя апошнія палонныя, што не патрапілі знайсьці ратунку.

І сяньня, хоць мора крыві й сьлёз і мільёны ахвяраў былі station станоўка за дарагою цаною, аднак, мелі сваё ўзьдзеяньне на заходні сьвет.

Прымусовыя масавыя рэпатрыяцыі, як відаць, ужо не паўторацца, навет коштам так горача жаданага саюзьнікамі замірэньня ў Карэі.

Прыкрае непаразуменьне

Кагадзе ДП — былыя савецкія грамадзяне, што выэміґравалі ў Вэнэцуэлу, сталіся ахвярамі прыкрага непаразуменьня. У працэсе агульнага паходу супроць замежных камуністых, улады Вэнэцуэлы пачалі хапаць першых, што трапілі ім пад руку, эміґрантаў розных нацыянальнасьцяў, былых ДП-уцекачоў з Савецкага Саюзу, й замыкаць іх у вязьніцах. Праўда, праз колькі дзён іх выпусьцілі, але й да сяньня яны ўсьцяж пад пагрозай і падазрэньнем, чакаючы кажнага дня новых прыкрасьцяў і гвалтаў. У сувязі з гэтым шэраг уцекачоў з Савецкага Саюзу, што апынуліся сяньня ў Вэнэцуэле, зьвярнуліся ад імя ўсіх ахвяраў „пільнасьці" вэнэцуэльскае ўлады із лістом у Камісію Правоў Чалавека пры Задзіночаных Нацыях. У гэтым звароце былыя савецкія грамадзяне з Вэнэцуэлы настойліва прасілі камісію зрабіць усё магчымае, дзеля абароны людзкіх правоў уцекачоў.

Узяў у гэтай прыкрай справе голас і Амэрыканскі Камітэт Вызваленьня народаў СССР, зьвярнуўшыся зь лістом да сп. Элэаноры Рузвэльт — Старшыні Камісіі Правоў Чалавека пры Задзіночаных Нацыях. У лісьце гэтым, паміж іншага, старшыня К-ту адмірал Кэрк піша:

„Зьвяртаюся да Вашае Камісіі з настойлівай просьбай зрабіць усё магчымае дзеля абароны чалавечых правоў уцекачоў. Наш Камітэт ня лучыць свае просьбы з якой-колечы крытыкай уладаў Вэнэцуэлы. Мы разумеем і падтрымліваем іхнае імкненьне выявіць і нэйтралізаваць камуністых і агентаў Крамлю. Але мы спадзяемся, што ў сувязі з гэтым ня будзе ўчыненая несправядлівасьць у дачыненьні да тых уцекачоў, якія глыбака варожыя савецкаму рэжыму і якія, якраз дзеля гэтага пакінулі свае Радзімы, часта із вялікаю небясьпекаю для жыцьця, расьсяляючыся па далёкіх краінах сьвету.

Амэрыканскі Камітэт жадае зазначыць важкасьць прызнаньня, як у Вэнэцуэле, гэтак і ў іншых краінах — праўды, што ўцекачы з Савецкага Саюзу із вельмі малымі выняткамі, — наважаныя ворагі камунізму і ўсіх ягоных чынаў. Яны ня толькі не камуністыя, яны **актыўныя проці-камуністыя.** Перацярпеўшы ўсе жахі й паніжэньні жыцьця пад уладаю крамлёўскіх дыктатараў, яны сяньня — саюзнікі незалежнага сьвету ў змаганьні супроць камуністычнае пагрозы. Было-б прыкра й нябясьпечна для справы будучага вызваленьня ўсіх народаў СССР, калі-б несавецкі сьвет ня меў магчымасьці зразумець гэта, стаўляючы пад пагрозу жыцьцё варожых саветам уцекачоў.

Свабодны сьвет усьцяж лепш разумее неабходнасьць паставіць выразную мяжу паміж маскоўскім рэжымам і ягонымі першымі ахвярамі — народамі СССР.

Якраз у гэткім пляне наш Камітэт настойліва просіць Вас зрабіць усё, залежнае ад Вас дзеля забясьпечаньня людзкіх правоў былых савецкіх грамадзян, якія бяз ніякага сумліву варожыя камунізму".

ПРЫНЦЫПОВЫЯ ПЫТАНЬНІ

Ледзь не ад году ўжо вядуцца ў расейскай і нерасейскай прэсе зацятыя спрэчкі у справе аснаўных прынцыпаў міжнацыянальнага сужыцьця народаў Усходняй Эўропы. Дзеля розных прычынаў апошнімі тыднямі спрэчкі гэтыя ізноў завастрыліся.

Хоць прынцыповае становішча прадстаўнікоў беларускай эміграцыі ў гэтых пытаньнях ужо ведамае, але сяньня не зашкодзіць падчыркнуць яшчэ раз нашае становішча ў трох аснаўных, зьвязаных з гэтым праблемах: 1. „дзяліць" ці не Расею?; 2. фэдэрацыя, ці не? і 3. за самавызначэньне народаў ці супроць?

Што да першага пытаньня мусім коратка заявіць, што мы супроць распадзелу **Расеі.** Беларуская эміграцыя стаіць у вабароне людзкай і нацыянальнай свабоды як свайго народу, так і ўсіх іншых народаў СССР, уключна з народам расейскім, і нямае ніякіх прэтэнсыяў ані да кусочка расейскае этнаграфічнае тэрыторыі ані не пасягае на драбок нацыянальнай свабоды й дзяржаўнай сувэрэннасьці народу расейскага, нічога болей, як гэтага самага чакаючы й ад народу расейскага ў дачыненьні да сябе. Ніводная беларуская палітычная партыя ня імкнецца адрываць ад Расеі нейкай Казанскай, Разанскай ці іншае вобласьці. Беларускі народ хоча быць адно вольным, незалежным гаспадаром свае зямлі і свайго лёсу.

Кліч „дзяліць Расею" прынцыпова няправільны й прапагандна шкодны. Дзеляць заўсёды нешта цэлае, адналітае, а савецкая імпэрыя з нацыянальнага гледзішча гэта толькі палітычны канцлягер шматлікіх народаў Эўропы і Азіі. Мы не за распадзел, а за цэласьць і непадзельнасьць як Расеі, так і Беларусі, Украіны й іншых народаў і іхных земляў у Усходняй Эўропе.

Што да другога пытаньня наш кароткі адказ: **мы за вольнае, мірнае, фэдэрацыйнае сужыцьцё ўсіх народаў, як Эўропы, так і сьвету.** І таму вось мы супроць „фэдэрацыі", накіданай сілком адным большым, азброеным народам — народам меншым. Такая „фэдэрацыя" — ніякая фэдэрацыя, а толькі замаскаваная палітычна-нацыянальная няволя зь нямінучым нацыянальным перасьледам народаў слабейшых ды з аддзяленьнем іх палітычнымі, эканамічнымі ды культурнымі зялезнымі заслонамі ад рэшты сьвету.

Высоўваную расейскімі палітыкамі пасярэднюю фэдэрацыю спачатку толькі з Расеяй, і толькі праз Маскву, а пасьля ўжо мо' і зь іншымі народамі Эўропы, — мы адхіляем, як лішні, непатрэбны этап, тымбольш, што праз усю сваю гісторыю (уключна з кароткатрывалым эпізодам Кераншчыны) Расея ня выказала ніякага зразуменьня для дэмакратычна-фэдэрацыйных формаў палітычнага сужыцьця з народамі суседнімі. Высоўваны некаторымі аргумэнт эканамічнай неабходнасьці такой фэдэрацыі з Расеяй няістотны, бо куды больш неабходная гаспадарчая фэдэрацыя ўсяе Эўропы. Беларусь найбольш скарыстае, калі будзе ў гаспадарчай вольнай сувязі з усімі народамі Эўропы, а не аддзеленая ад яе на жаданьне і капрыс валадароў Масквы, як гэта было дагэтуль.

Прынцып самавызначэньня народаў — гэта кардынальны прынцып дэмакрацыі, і мы яго ня толькі прызнаём, але й вядзем увесь час палітычнае за яго змаганьне. Беларускі народ ужо даўно самавызначыўся, выявіўшы гэта на сваім Усебеларускім Кангрэсе ў 1917 г. у Менску, як і абвесьціўшы пазьней актам 25 сакавіка аб незалежнасьці Беларус-

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

П. Вішнеўскі

Амэрыка й беларусы

Думкі на часе

Гэтым летам споўнілася адна важная, хоць нідзе й нікім не адзначаная гадавіна — мінула сем год ад часу першае сустрэчы амэрыканскіх ваенна-палітычных дзейнікаў з прадстаўнікамі Беларускага Вызвольнага Руху на эміграцыі. Як не малаважнай падзея гэта, пэўне-ж, была й ёсьць для амэрыканцаў, — для нас яна астанецца на заўсёды вымоўным паказьнікам таго злачаснага незразуменьня, а нярэдка проста ігнарацыі, якія характарызавалі адносіны пасьляваеннага Захаду да праблематыкі ўсходняе й сярэднае Эўропы, якую гэны-ж Захад у той час нядвузначна й адкрыта аддаваў да выключнае „кампэтэнцыі" свайго камуністычнага саюзьніка. Вычувалася выразна, што-гэны „саюзьнік", якіх мала..., ня спаў у шапку, а ўсялякімі пунктамі ўмоваў ды кляўзулямі да іх патрапіў спрытна зьвязаць Захад шматлікімі забавязаньнямі і гэтым на даўгія гады спаралiжаваць вызвольна-палітычную працу свайго найбольшага ворага — анты-камуністычнае й проці-маскоўскае эміграцыі.

Першыя сустрэчы нашых палітычных прадстаўнікоў з амэрыканскімі дзейнікамі ў зруйнаванай вайною Нямеччыне мелі драматычны прабег і канчатак. З энтузыязмам, з адкрытым шчырым беларускім сэрцам і з поўным даверам пакутнікаў за паднявольны свой край мы йшлі да тых, хто ў сваіх і нашых вачох быў непахісным сымбалем ідэі свабоды й незалежнасьці. Мы ня йшлі з просьбамі аб дапамозе, канцэсіях, ці г. п. У мамэнт перамогі над адным тыранам і запрысяжанай яму клікай псыхапатаў, мы йшлі ахвяраваць сябе, нашае дазнаньне й наш энтузыязм на змаганьне з тыранам тыранаў, чырвоным катам і бязвольнымі стадамі ягоных прыслужнікаў, роўных якім па зьдзічэньні гісторыя ня ведае. Праўда, хутка выявілася, што ня толькі гісторыя, але й сучаснасьць мела тады вельмі-ж цьмяное яшчэ уяўленьне аб запраўдным твары маскоўскае гідры. Але для нас у той час стаяла нязьбітай лёгікай, што выратаваўшы сьвет ад аднае сьмяротнае небясьпекі й выдатна змагаючыся на Далёкім Усходзе з другою, Амэрыка ня супыніцца на поў-дарогі, а крыжовым паходам павядзе свабодалюбныя народы сьвету супроць чырвонага цара і ягонае хэўры, што прытаіўшыся за крамлеўскімі мурамі, гэным адвечным гняздом маскоўскае дэспатыі, адно чакае прыгоднага мамэнту, каб распаліць сусьветны пажар братабойчае вайны і кінуць увесь род чалавечы ў бяздоньне апокаліптычнае катастрофы. Нас не зразумелі... Нас ня выслухалі навет; наш юнацкі запал да чыну й ахвяраў быў жорстка адкінены. Слова „жорстка" дужа недакладна перадае стан фактычны, калі зважыць, што таму-сяму за шчырасьць пачуцьцяў гадамі давялося пакутваць у лягерох для інтэрнаваных, разам з Гудэр,янамі, Дэніцамі і інш. У Нюрнбэрг, што праўда, ніхто ня трапіў.

Усё-ж ніхто ня скажа, што гэныя сумныя падзеі зусім зьнеахвоцілі былі беларускую палітычную эміграцыю да амэрыканцаў і іхняе палітыкі. Хоць шырэйшыя кругі эміграцыі, як нашае, так і іншых паняволеных народаў, бязумоўна пачуліся балюча расчараванымі, а вера ў Амэрыку, як вядучую сілу ў вольнай частцы сьвету, як і давер да адказных кіраўнікоў амэрыканскае палітыкі, былі моцна падарваныя — адказныя дзейнікі Рады і Ураду БНР пэсымізму не даліся й рук не папушчалі; ніводная нагода да набліжэньня і ўзаемнага паразуменьня з амэрыканцамі ня была занядбаная. Неафіцыйна й поў-афіцыйна, праз жывы беспасярэдні кантакт, ці праз пасярэдніцтва прыязных нам кругоў у Нямеччыне, Парыжы ці Лёндане (да Вашынгтону яшчэ было далёка), высылаліся прадстаўнікі, дэлегацыі, складаліся мэмарыялы з пераканальнымі інфармацыямі ды прапановамі, часта з настойлівымі дамаганьнямі. Даўгі час гэтая праца была няўдзячнай і прыкрай. Доўга даводзілася задавальняцца ветлівымі ды беззьмястоўнымі адказамі. Усё-ж у канцавым разьліку яна зрабіла сваё і прынесла ўсе магчымыя ў сяньняшнім палітычным палажэньні пазытыўныя вынікі. Аптымізм і гэтым разам сябе апраўдаў.

Трэба выдзяліць дзьве аснаўныя прычыны стойкасьці пра-амэрыканскага курсу нашае палітыкі, які ўтрымаўся ня гледзячы на ўсе расчараваньні й няўдачы. Першай ёсьць факт, зь якога ўсе мы добра сабе здаем справу, а менавіта, што ЗША сяньня адзіная ў сьвеце сувэрэнная моц, здольная даць, хай і на свой спосаб, ня толькі належны адпор як ідэйна-падрыўному, так і мілітарнаму ціску з боку Масквы, але ў належны мамэнт перайсьці і ў контр-атаку, скансалідаваўшы вакол сябе ўсе свабодалюбныя народы, сьведамыя пагражаючае ім небясьпекі. Амэрыка мае на гэта ўсе патрэбныя атрыбуты, ня гледзячы на ўсе хібы амэрыканскае палітыкі за мінулых дзесяць год. Без Амэрыкі навет і Задзіночаныя Нацыі, якія яны там ня ёсьць сяньня, бясcумліўна сталіся-б арганізацыяй фікцыйнай, папяровай, няздольнай да ніякае акцыі супрацiву маскоўскай агрэсіі. Мы ведаем, што Амэрыка — гэта адзіная і апошняя бар'ера на шляху гэнае агрэсіі. Мы ўдзячныя ёй за гэта і прыймаем яе такой, якой яна ёсьць, з усімі ейнымі нязвычайнымі блескамі й ценямі.

Другая прычына — гэта самы амэрыканцы, іхняя прырода, іхны нацыянальны характар. Трэба прызнаць, аб чым на дзіва мала дасюль пісалася, што амэрыканцы маюць у сваім характары своеасаблівыя рысы, якія рэзка выдзяляюць іх з-паміж усіх іншых сучасных нацыяў сьвету. Нас цікавяць тут адно некаторыя з гэных рысаў, перш за ўсё тыя, што знайшлі ўжо свой адбітак на міжнародна-палітычным грунце.

Дзякуючы, з аднаго боку, прыгожым традыцыям геройчнага змаганьня свайго народу за свабоду, незалежнасьць і нутраную кансалідацыю — традыцыям, на якіх па сяньняшні дзень базуецца ўся сыстэма філязофіі амэрыканскага жыцьця — а з другога боку і ў ня меншай меры, дзякуючы блізу што 120-гадоваму пэрыяду палітычнага ізаляцыянізму, у выніку якога Амэрыка была дабраахвотна сыйшоўшы з арэны палітычнае гульні эўрапэйскіх гаспадарстваў, пакінуўшы ею цікавіцца ў замен за датрыманьне таго-ж прынцыпу неінтэрвэнцыі з боку Эўропы ў дачыненьні да амэрыканскага кантынэнту — вось дзякуючы гэтым двом фактарам, сваей палітычнай традыцыі й дактрыне Монроэ, калі амэрыканцы вярнуліся, або дакладней кажучы, калі вельмі рэальная небясьпека раптоўна паклікала іх назад на міжнародную палітычную арэну, яны зьявіліся на ёй як ідэалістыя чысьцейшае вады і, трэба ім гэта прызнаць, асталіся гэткімі да сяньня. Ясна, што не магло гэта астацца бяз уплыву на палітычных выгнанцаў з-паза зялезнае заслоны. Ці сталася яно добра ці блага, але факт астаецца фактам, што вера ў гэны амэрыканскі ідэалізм патрапіла запусьціць глыбокія карэньні у беларускую палітычную эміграцыю й сталася праводняй зоркай нашых палітычных дачыненьняў з амэрыканцамі па сяньняшні дзень. Ня ўсе мы дакладна сабе ўяўляем значаньне гэтага факту; ня ўсім нам зразумела, што ён-жа й прымушае нас лічыцца з безпасярэднімі вынікамі таго ідэалізму, якімі-б яны ня былі. А вынікі гэтыя даюць нязвычайна пярэсты абраз.

На рахунак амэрыканскага палітычнага ідэалізму трэба аднесьці ўсе дасягненьні й няўдачы амэрыканскае замежнае палітыкі за час другое сусьветнае вайны й пасьля яе. Шмат далося-б аб іх сказаць, але дзеля нястачы месца й часу абмяжуемся тут адно кароценькай характарыстыкай аснаўных мамэнтаў, неабходных для тэмы гэтага артыкулу.

1. У пераладаваную нечаканасьцямі й няпэўнасьцю палітычную атмасфэру сьвету, у якім пераважала тады небясьпечная й звыраднелая, адвечная сварка у Эўропе з выдатна пасуючым да яе па духу японскім партнэрам у Азіі, — Амэрыка ўнесла новы тон з тэй маладняцкай сьвежасьцю, энэргіяй і верай, на якія ніхто ўжо ў Старым Сьвеце здабыцца ня мог, а натарычная нястача якіх была давёўшы да паступовага паралiжу й заняпаду Лігі Нацыяў. Хоць нельга сказаць, каб Задз. Нацыі паўсталі вылучна з амэрыканскага пачыну, усё-ж жывую душу гэтай арганізацыі, здольнасьць руху й сілу акцыі далі ёй бясспрэчна амэрыканцы, разьвязаўшы гэтым, прынамся часова й частковa, адну з найцяжейшых праблемаў, аб якую разьбіваліся дасюль усе спробы стварэньня міжнароднае арганізацыі падобнага тыпу — менавіта, праблему міжнароднае экзэкутывы. У гісторыі міжнародных дачыненьняў і экзэкутывы міжнародных забавязаньняў, а тым самым і магчымасьці ажыцьцяўленьня ідэі зуніфікаванага міжнароднага права, амэрыканцы занялі пачэснае месца, як пачынальнікі новае пераломнае эпохі.

Калі-ж справа йдзе аб нас, беларусоў, дык наш непапраўны ідэалізм, ізноў-жа як адна з нашых характэрных нацыянальных прыкметаў (ня будзем тут спрачацца аб ейным абсягу й практычнай вартасьці), не выпадкам стаўся ідэальна датарнаваным па духу да амэрыканскага палітычнага ідэалізму й ягоных вышэй успомненых пазытыўных аспэктаў. Нашая грамадзкасьць і палітычная думка із зразуменьнем і надзеяй сачылі й сочаць за разьвіцьцём арганізацыі ЗН і гэта не таму, што на гэтым міжнародным форуме й нашаму народу фармальна прыслугоўвае голас. Мы ведаем, хто гэным голасам карыстаецца і ў чыіх інтарэсах. Беларускаму народу з гэтага аніякае карысьці, а шкоды столькі, наколькі здабудзецца маскоўская вынаходлівасьць. Нашая вера ў ЗН — гэта вера ў тую вялікую ролю, якую гэтая арганізацыя можа згуляць у выратаваньні чалавецтва ад загубы.

2. Амэрыканскі палітычны ідэалізм праявіў сябе значна шырэй і ў аспэктах далёка менш пахвальных і абнадзейвальных для нас як палітычных эмігрантаў. Дзякуючы другой агульнай уласьцівасьці амэрыканскае натуры, выдатна ўхопленай славутым ангельскім філёзафам Бэртрандам Рассэль, і коратка здэфініяванай ім як свомасьць дзеяньня „не па імпульсу, а па прынцыпу", або схільнасьць да прынцыповага фармалізму, што на адно выходзіць, — іхны палітычны ідэалізм хутка набыў рэзка фармалістычных адзнакаў, якія праявілі сябе найвыяўней у неасьцярожна схематычным трактаваньні палітычных партнэраў у часе вайны й доўга пасьля яе, ня гледзячы на відавочныя шматлікія довады, якія некаторых з гэных партнэраў (камуністых) папраўдзе дыскваліфікавалі як такіх, суляючы найбольшую меру асьцярожнасьці ў дачыненьнях ізь імі. Асьцярожнасьць гэная ня была захаваная. Гэта дазволіла Маскве ў самы нахабны спосаб выцягнуць вялізарнага маштабу матар'яльную й палітычную карысьць і фактычна выратавацца з тае катастрофы, у якую кінуў яе іншы „дастойны" партнэр. Мала таго, Масква патрапіла выкарыстаць поўную непаінфармаванасьць амэрыканскіх палітычных дзейнікаў і грамадзкае апініі аб жудаснай мартыралёгіі паняволеных ёю народаў, каб, грунтуючыся на прынцыпе поўнага няўмешваньня ў „хатнія" справы партнэра, палажыць асновы пад доўгатрывалую „ідэалістычна-прынцыповую" незацікаўленасьць Амэрыкі ў падсавецкай праблематыцы. І тут амэрыканцы свайго „партнэра" ні ў чым не падвялі... Няясным толькі астаецца пытаньне, ці тая шалёная прасавецкая й камуністычная прапаганда, што ўсё яшчэ ня сьціхае на тэрыторыі ЗША, а раскладальныя вынікі якой адчуваюцца найбольш балюча ня кім іншым як нашай тут, беларускай эміграціяй, ці права на яе вядзеньне таксама йдзе на рахунак таго слаўнага прынцыпу няўмешваньня і г. д.? Відаць, што камуністыя таксама не падвялі сваіх прынцыпаў. А гаркім плодам можа сабе пацешыцца беларус, — праўда, ужо бяз ніякіх прынцыпаў...

(працяг будзе)

Найвялікшае рабаваньне Беларусі

...„Плывуць на усход цягнікі —
Лён, жыта, сасна і бяроза.
Гляджу і гляджу з пад рукі,
як моладасьць нашу вывозяць..."

Больш за трыццаць год чырвоная Масква рабуе нашую Бацькаўшчыну — Беларусь. Дэпартуюцца людзі, вывозяцца прыродныя багацьці беларускае зямлі... І ўсёткі маскоўскія рабаўнікі ізноў знайходзяць новыя магчымасьці рабаваньня Беларусі й беларусаў. У сувязі з „вялікімі пабудовамі камунізму" яны прымушаюць наш народ цяжка, звыш звычайнага працаваць. Уся гэтая акцыя рабаўніцтва хаваецца звычайна пад хлусьлівым клічам аб „гонары" ці „захапленьні" людзей удзелам у „вялікіх пабудовах". Падаем тут адно кароткі агляд некаторых галінаў прамысловасьці Беларусі, якія працуюць на патрэбы чырвонае Масквы й на „вялікія пабудовы камунізму". Хай ня вычарпальны, — ён вымоўна сьветчыць аб шырыні жахлівае акцыі рабаваньня нашае Бацькаўшчыны камуністычнымі маскоўскімі акупантамі.

Маленькая даведка

Блізу два гады таму зь вялікім шумам Саветы абвесьцілі аб пачатых імі „вялікіх пабудовах камунізму": электарняў у Куйбышаве, Сталінградзе, Кахоўцы ды каналаў Волга-Дон, Паўдзённа-Украінскага й Паўночна-Крымскага. З таго часу няма дню, каб бальшавіцкія газэты не паведамлялі аб ходзе працаў і аб „важкіх здарэньнях на пабудовах".

Гэтыя „вялікія пабудовы", як і наагул усё, маскоўскія бальшавікі выкарыстоўваюць, зразумела, дзеля свае „прапаганды міру", намагаючыся давесьці, што „міралюбныя савецкія народы" будуюць камунізм, тады як „падпальшчыкі вайны" на чале з ЗША, ліхаманкава узбрайваюцца, каб напасьці на СССР. Ясна, што ў гэтай прапагандзе нідзе не ўспамінаецца, што вялізманае павялічэньне энэргіі СССР служыць у першую чаргу якраз мэтам ваеннае прамысловасьці. Усе гэтыя пабудовы — на усходзе, паблізу вялікіх цэнтраў вайсковае прамысловасьці Уралу й Кузьнецкага басэйну і ясна, што будуюцца яны тут зусім не дзеля „міралюбасьці" Саветаў у дачыненьні да рэшты сьвету.

Няма прадпрыемства, якое-б не працавала сяньня дзеля сталінскіх „пабудоваў".

За выняткам ваеннае прамысловасьці (аб ёй бальшавіцкі друк маўчыць, як вады ў рот набраўшы), — уся прамысловасьць БССР працуе на патрэбы гэтых „пабудоваў". Няма сяньня ў нас ні аднае фабрыкі ці майстэрні, якія не прытарнавалі-б да іх сваю вытворчасьць. Дзеля гэтых пабудоваў патрэбная вялікая колькасьць будаўляных матар'ялаў і транспарту, а таксама й машыны. Таму нашыя народныя багацьці й рабуюцца так безаглядна на ўмацаваньне сталінскага прымусу й панаваньня.

Драўляныя матар'ялы, мэблі, стандартныя дамы.

У першую чаргу йдуць на пабудову Масквы беларускія лясы, хай яшчэ й сяньня сам беларускі народ шмат дзе жыве ў зямлянках. Дзеля мясцовых патрэбаў звычайна выдзяляюцца найгоршыя лясныя дзялянкі, якія й пакідаюцца бяз увагі. Усё, што пабудаванае па вайне на вёсках — выключна праца самых сялянаў, „калгасьнікаў", як яны сяньня ў акупаванай Беларусі завуцца, да чаго шчыра прызнаецца на'т бальшавіцкі друк. Каб выканаць „ганаровыя заказы", сагнаныя сяляне высякалі лес пад наглядам кіраўнікоў-паганятых камуністых і ўдзень і уначы, пры сьвятле вялікіх вогнішчаў з гальля.

Частка гэтых матар'ялаў найшла далей непрацаваная, але над рэштаю беларускія майстры змушаныя былі добра напрацаваць.

Гэтак вялікае прадпрыемства — дрэваапрацавальны камбінат Бабруйску выслала ўжо колькі цягнікоў свае прадукцыі на „вялікія пабудовы" і сьпяшаецца запэўніць акупанта, што і ўсе далейшыя заказы будуць выкананыя загадзя і з надвышкай. Як падае савецкая прэса, прадпрыемствы Бабруйску й Ві-

(Канец на 4 бал.)

ПРЫНЦЫПОВЫЯ ПЫТАНЬНІ
(Канец)

кай Народнай Рэспубліцы. І калі-б гісторыя ізноў паставіла гэтае пытаньне перад беларускім народам у вольных палітычных умовах — адказ будзе той самы, што і адказ Усёбеларускага Кангрэсу. Аб самавызначэньні можна гаварыць там, дзе яшчэ загадзя народу дадзеная магчымасьць вольна сказаць сваё слова. Сьпярша народ мусіць мець свабоду. Тады толькі ягоны адказ у гэтай справе будзе абавязваць. І таму мы супроць прапанаванага „самавызначэньня" у рамах яшчэ жывых дзяржаўных ці палітычных сувязяў з Масквою. Свабодны народ сам скажа сваё слова й наіўным было-б спадзявацца, што ён адмовіцца ад свабоды, ды ізноў будзе прасіць, каб яму прысылалі каб „кіраваць і валодаць" ім камісараў, ваяводаў, генэрал-губэрнатараў ці іншых гаўляэтэраў з Масквы, Варшавы, ці яшчэ зьнекуль.

Мы таксама супроць „самавызначэньня" у гэткіх палітычных умовах, што існуюць сяньня ў Беларусі, дзе мільёны пакутуюць на ссылках, а на іхнае месца навезеныя хмары расейскай бюрократыі, калгасных цівуноў ды азіятаў. Толькі пасьля звароту свабоды беларускаму народу і пасьля праведзенай рэпатрыяцыі беларускага, расейскага ды іншага жыхарства надыйдзе час, калі сваё непахіснае слова скажа **увесь** беларускі народ праз свой Ўстаўадаўчы Сойм.

Такія нашыя адказы на тры аснаўныя пытаньні ў справе суіснаваньня жыцьця паміж народамі Усходняй Эўропы. Паўтараем — мы ня хочым дзяліць Расеі, а хочам толькі волі ўсім народам, паняволеным бальшавіцкаю Масквою. Мы за вольную фэдэрацыю ўсіх вольных народаў Эўропы. І мы за свабоду і незалежнасьць беларускага народу—аснаўную умову праяўленьня ягонае волі ў пытаньні „самавызначэньня".

С. Б.

Зьмены у Камітэце Вызваленьня

Усьлед за газэтай „Нью-Ёрк Таймс" ад 15-га жніўня падаем паведамленьне аб пераходзе адмірала А. Г. Кэрка на новую пасаду дырэктара Бюра Псыхалягічнае Стратэгіі.

— „На працягу апошніх 18 месяцаў", піша газэта, „зьмяніліся аж тры дырактары гэтае ўстановы і сяньня, з момантам вызначэньня дырэктарам адмірала Кэрка, ёсьць падстава спадзявацца, што Бюро Псыхалягічнае Стратэгіі атрымае нарэшце сталага кіраўніка, які будзе мець магчымасьць абаперці сваю працу на больш трывалай у часе аснове".

— „Адыход адмірала Кэрка з ягонага дасюлешняга становішча старшыні Камітэту Вызваленьня", — дадае газэта — „мэтай якога было асягненьне пагадненьня паміж уцекачамі з краінаў, паняволеных Саветамі, пакіне пусьціню, што будзе балюча адчутая".

Як мы давядваемся з тых самых крыніцаў, справа гэтая, аднак, ужо заладжаная, бо на месца адмірала Кэрка вызначаны новы старшыня — таксама марскі афіцэр-інжынер віцэ-адмірал Лэсьлі К. Стывенс, былы марскі аташэ пры пасольстве ЗША ў Маскве ў 1947-49 гадох.

Ю. Віцьбіч

»І гарыць вачыма карымі горкі прыпамін«

Да ўсіх гэтых абвінавачваньняў сам Хадыка ставіўся з нявысолўнай пагардай. Прынамсі аднойчы ў багэмаўскім шынку, прапануючы мне вінігрэту, які ў той асабліва галодны час складаўся адно з бульбы, буракоў і капусты і зваўся на мове падсавецкіх людзей „сілосам", г. зн. ежай для жывёлы, — ён із саркастычнай усьмешкай прыгадаў словы Маякоўскага:

Ешь ананасы,
рябчиков жуй,
День твой последний
приходит буржуй.

За шчупакамі й шчупанятамі узяць удзел у цкаваньні Хадыкі сьпяшалася літаратарская плотка — ударнікі, мабілізаваныя з фабрыкаў і заводаў у беларускую літаратуру. Крыху пазьней яны, пасьля першых-жа сваіх „спробаў пралетарскага пёрка", безнадзейна абанкруціцца, як літаратары, нават у вачох сваіх каханак, але цяпер адзін зь іх — больш таленавіты — Алесь Зарыцкі — зьмяшчае на старонках камсамольскай газэты „Чырвоная Зьмена", памфлет, прысьвечаны Хадыку й Віцьбічу:

Маленькая рэчка —
з добры глок,
На гары парэчка —
доле глог.
Там калісьці некалі,
некалі
Два жаўнеры ехалі,
ехалі.
Шаблі паламаны,
у вачок туман,
У дзірках даламаны
і г. д.

Але першае мейсца ў цкаваньні Уладзімера Хадыкі належала Андрэю Аляксандровічу, які ў аднэй із сваіх паэмаў зазначыў сьпярша аб сабе, а потым ужо і аб нашай краіне:

А па Аляксандровічу Андрэю
ахрысьцілася ў завеях
і цяпер завецца
Беларусяй Савецкай.

Аднак за гэтае цкаваньне Аляксандровіч атрымаў досыць нечаканую для сябе й сваіх аднадумнікаў, але цалкам слушную й заслужаную зьнявагу.

Калі ў Менску адмысловая, пераважна з камуністых складзеная, камісія прымала беларускіх літаратараў у склад Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР, дык Хадыка ня толькі ня быў прыняты ў сябры ССПБ, але ня трапіў і ў кандыдаты. Такая пастанова выклікала агульнае абурэньне беларускае пісьменьніцкае грамадзкасьці. Вычуўшы гэтае, Андрэй Аляксандровіч на другім пленуме ССП СССР, што адбываўся ў Менску, у сваім дакладзе, прысьвечаным беларускай паэзіі, паспрабаваў вынесьці Хадыку жорсткі прысуд. Ён імкнуўся давесьці, што творчасьць Уладзімера Хадыкі ня мае аніякага грамадзка-палітычнага, а, значыцца, паводле савецкіх крытэрыяў, і мастацкага значаньня. Ён жадаў гэтым зачыніць перад Хадыкам дзьверы ўсіх рэдакцыяў і канчальна выкрасьліць яго з літаратарскага жыцьця. Беларускія пісьменьнікі, сьціўшы зубы, маўчалі — яны былі ўжо ладне падбіты, каб мець мужнасьць у голас выказваць сваю нязгоду. І нечакана забраў слова вядомы расейскі паэта Мікалай Асееў. Ён сказаў, што адзін з апошніх вершаў Уладзімера Хадыкі, дзе ёсьць выраз, як на небе:

„маланкі сіняй крэдай ліст пісалі"

— зьяўляецца клясычным вузорам запраўднага вялікага мастацтва. І яшчэ больш нечаканым для Аляксандровіча сталася тое, што ўвесь пленум даўгімі воплескамі ўдзячна ўзнагародзіў Асеева за гэтыя словы.

У адзнаку свайго захапленьня, саладнасьці й сымпатыі да Хадыкі рэагаваў на заўвагу Асеява. Усім яшчэ раз сталася відавочным, што гэты адзін вобраз Хадыкі вартасьцю большы, чымся ўся творчасьць Аляксандровіча, хаця яна й выдаецца „в золотом тисненных переплетах". Пісьменьнікі адзін па адным падыходзілі да Хадыкі, паціскаючы моцна й цёпла ягоную руку.

Першым ускаквае зь мейсца й накіроўваецца да яго сарамяжлівы Васіль Каваль. На ім ужо нябясьпечная ў той час вышываная кашуля на магілёўскі вузор і такі-ж вузкі, тканы паяс з кутасікамі. Ідзе, здаецца з адных нэрваў пабудаваны, Міхась Багун. Пазьней ён памрэ ад разрыву сэрца ў Марынскім канцэнтрацыйным лягеры, і над ім нярухомым сябры адсьпяваюць у паўголас прачулы „Запавет" Тараса Шаўчэнкі. Сьпяшаюцца ўзвышэнцы Тодар Кляшторны й Сяргей Дарожны. Другому НКВД высуне абвінавачваньне ў тым,

(Канец на 4 бал.)

Вялікая памылка

Які тыдзень таму адмірал А. Г. Кэрк, былы старшыня Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня народаў СССР, выслаў кароткі, але знамянны сваім зьместам ліст, які быў прачытаны у Нью-Ёрскім клюбе расейскае моладзі на ўрачыстасьці, прысьвечанай 6-тым угодкам разгрому Уласаўшчыны, і зьмешчаны пасьля ў „Новым Рускім Слове".

Чытаючы гэты ліст, цяжка даць веры, што мог яго напісаць такі знаўца СССР і такі шчыры дэмакрат і ідэалісты, як адмірал Кэрк. Запраўды выглядае на нейкае трагічнае непаразуменьне, калі чытаеш у лісьце, што „высокія матывы і ідэалізм, што кіравалі ген. Уласавым, часта разумеліся няправільна"...

Нам, беларусам, дзіўна навет чуць гэта. Аб ген. Уласаве і ягонай кампаніі, яшчэ тады, калі яны цешыліся найлепшым здароўем у пышна-абстаўленых гатэлях Карльсбаду, ці тады, калі ім давялося няслаўна згінуць у руках, што іх перахітравалі, — мы ведалі адну, непахісную для нас праўду — што ўся іхная „ідэалістычная" праграма вычэрпвалася адным адзіным пунктам „матушкі Расеі", г. зн. ня простай, чэснай, дэмакратычнай дзяржавы расейскага народу, але новай расейскай імпэрыі, з падпарадкаванымі ёй народамі-нявольнікамі, а гэтым самым і з новымі кацэтамі, із старым Сібірам і г. д.

Гэтае нядвузначнае „ідэі" не заслоняць перад нашымі вачыма ніякія туманы словаў, дэкляраціяў і плятформаў. Ці-ж ня гэтая самая здань стае сяньня грозным мэмэнто перад усім чалавецтвам? Гітлер намагаўся паставіць яе сабе на службу не здарма, — відаць, яна пасавала і да ягоных ідэяў і ўсяе справы.

Таму ня можна зможучыць, калі паважаны адмірал накідае „народам Расеі" Уласава як „аднаго з найвыдатнейшых змагароў за іхную свабоду".. Гэта ўжо бязглуздзіца. Трэба, каб амэрыканскія дзейнікі, і ўсе, хто верачь у прыгожыя словы бяз зьместу, ведалі, што пачынаючы ад 1917 году й па сяньня із свечкай у руках не знайсьці сярод расейскіх палітычных дзеячоў (ня трэба іх мяшаць із расейскім народам!) навет аднаго чалавека, які шчыра стаў-бы ў абароне свабоды якога-колечы падсавецкага народу. Нашая свабода смакуе ім якраз гэтак, як нам іхная няволя. Людзі гэтыя — гэта апошнія экзэмпляры хворых на тую небясьпечную хваробу, зь якое так радыкальна былі вылячаны італьянскія фашысты, нямецкія нацысты ды японскія лёгкадумы. Уласаў быў адным зь іх — і гэта ведамае ўсім паняволеным народам, якім ён мог жадаць усяго, толькі не запраўднага вызваленьня з маскоўскага ярма.

Клім

У. Хадыка



ГУДУЦЬ СЛУПЫ

Гудуць слупы. На небе жменька зорак.
Калыша вецер над ракой вярбу.
Заспаны месяц выйшаў на пагорак
З кавалкам хмар пуховых на гарбу.

Я прывітаў яго знаёмым словам,
Сьціскала шапку кволая рука...
Ішоў сюды яшчэ хлапцом вясковым
Я дум жывых і чыстых кроз шукаць.

Вяла у даль суровая дарога,
Завеі лютыя зьбівалі сьлед.
Цяпер жыву, удумлівы і срогі,
Як песень — зор лірычнейшы паэт.

На кола дзён, знаходлівы і шчыры,
Кладу сваю пясьнярскую душу.
З усіх сяброў я самы сьціплы лірык —
У кішэнях вершаў навет не нашу.

Агнём жыцьця я слаўлю родны горад
Пад сьпеў зары, пад сьпеў гульлівых бур...
...Гудуць слупы. На небе жменька зорак.
Калыша вецер над ракой вярбу.

М. Менскі

МАЕ УСПАМІНЫ

(Янка Купала)

(Працяг)

У сэрцы Янкі Купалы, апрача собскіх балючых расчараваньняў, была яшчэ адна незагоеная рана — кроўныя сувязі. Сваякі ягоныя, сябры юнацтва — усе засталіся ў Вялейшчыне, па баку Пальшчы. Зялезная заслона Саветаў не дазваляла яму ня толькі што адведаць родныя куткі, а навет мець із сваімі роднымі лістовую сувязь. Дзяцей Купала ня меў. Гадаваньне чужых (а Купала й ягоная жонка выгадвалі іх ледзь не дзесятак), хоць і давала некаторую ўцеху, але замяніць сваіх усё-ж не магло. Туга па сваіх, па родных і блізкіх у Саветах адчувалася асабліва балюча, бо й гаварыць аб гэтым было ня надта бясьпечна, трыманьне-ж сувязі із „замежжамі", перапіска, хай із найбліжэйшымі па крыві сваякамі, — пагражала турмою й выгнаньнем. Таму можна ўявіць сабе радасьць Купалы, калі ў верасьні 1939 году мяжа паміж Усходняй і Заходняй Беларусяй была сьцертая й Савецкія войскі увайшлі на прастору б. Польшчы.

Жыцьцёвых парадоксаў бывае шмат. Адным зь іх было й тое, што Купала, гуляючы (не на свае, праўда, ахвоце) усе мінулыя гады ролю вялікае палітычнае вагі, ніколі запраўды палітыкам ня быў і ў палітычных пытаньнях, звычайна, блытаўся, не разумеючы на іх. Ды й ці адзін ён успрыймаў тады савецкі наступ на польскую прастору, як дадатнае зьявішча, як запраўдную „брацкую руку" паняволенаму беларускаму народу? Грамадзяне заходняе Беларусі таксама-ж часта-густа сустракалі чырвоную армію трыумфальнымі брамамі й краскамі, віталі яе як вызваленьне. Польшча была мачыхаю для беларускага народу і маральны, а ў апошнія гады й цяжкі фізычны ейны ціск на беларусаў адчуваўся усюды, хто імкнуўся да волі й незалежнасьці бацькаўшчыны. І калі хітрая палітыка Сталіна пачала у першых тыднях „вызваленьня" граць на гэтых нацыянальных беларускіх струнах, выстаўляць „на паказ" сваю беларускасьць, — дык гэта прымусіла шмат каго, незнаёмага з усёй хлусьлівай савецкай натурай, шчыра паверыць „вызваленьням". Памятаю як мяне й маіх сяброў, што сядзелі ў аднэй тэатральнай лёжы, дзе быў з намі й Купала, літаральна ускалынула адно здарэньне. У Беластоку быў прыехаўшы вялікі калектыў Менскае Філярмоніі і ў Гарадзкім Тэатры ішоў канцэрт. На гэты канцэрт з усіх куткоў Заходняе Беларусі былі прывезеныя дэлегаты, пераважна настаўнікі вясковых школаў ды сяляне. І вось калі танцавальны ансамбль Філярмоніі пачаў скакаць на сцэне „Лявоніху", — усе гэтыя простыя, шчырыя людзі, уся заля, заместа воплескаў і крыкаў: „брава" зусім неспадзявана, голасна, не саромеючыся заплакала, рукавамі й хусткамі выціраючы сьлёзы, што нястрымна ліліся з вачэй. Танцоры, навет, зусім былі зьбянтэжыліся, ня ведаючы ў чым справа, бо нідзе дагэтуль іх гэтак ня прыймалі, нідзе не адказалі сьлязьмі на гэты вясёлы, жвавы беларускі танец. Мы-ж, разумеючы прычыну плачу гледачоў, якія дарма што столькі год прыгнётам, захавалі ў сэрцах высокае пачуцьцё любасьці да свайго роднага, нацыянальнага, — ледзь не заплакалі самы. Дык ці дзіва, што на першых пачатках так шмат беларусаў паверылі савецкай спрытнай мане і пазьней прыйшло шмат пазьней?

Колькі тыдняў пасьля пераходу мяжы савецкімі войскамі, вялікі аўта-транспарт Зісаў і ЭМачак адыйшоў пад вечар ад будынку менскага ЦЭКА. Ехалі гэтым транспартам колькі адказных прадстаўнікоў партыі й даволі вялікая група беларускіх мастакоў — кампазытараў, артыстых, пісьменьнікаў. Заданьне гэтае групы было яснае, чыста прапагандное — пазнаёміць грамадзянаў Заходняе Беларусі із „цудамі савецкага раю".

У гэтай групе апынуўся й Купала, а зь ім пашчасьціла ехаць і мне. Настрой у нас усіх быў крыху усхваляваны, бо каму-ж не хацелася пабачыць тое нядаўна яшчэ „замежжа", што, недасьцігласе пару тыдняў таму, сталася цяпер неад'емнаю часткаю нашае БССР?

Ужо цямнела, калі мы мінулі былую дзяржаўную мяжу Пальшчы ў Негарэлым і Койданаве. Мэтаю нашай былі насамперш Стоўбцы. Дарога йшла лесам. Гэнам і гэт гарэлі вайсковыя вогнішчы, ад часу да часу то зьблізка, то здалёку чуліся адзіночныя стрэлы. Мы ўсе прыйлынулі да вакенцаў самаходу й пільна сачылі за навакольнымі краявідамі. Купала ажно рукамі абняў шыбу, быццам гэта магло дапамагчы яму лепей бачыць. Пачалі паказвацца вёскі. Купала штурхнуў мяне ў бок, быццам гаворычы: „бачыш, братку?" Я, ведама, бачыў. Вёскі былі прыгожыя, чыстыя. Хаты добра крытыя, з выразанымі, маляванымі вакяньніцамі, добра зашклёнымі вокнамі, з вясёлымі гародчыкамі поўнымі пышных вяргіняў і мальваў. Усё гэта было так непадобнае да бедных, шэрых калгасных вёскаў савецкае зямлі, што не заўважыць розьніцы было немагчыма.

Да Стоўбцаў дацягнуліся мы, калі ужо зусім сьцямнела. Нас падзялілі на невялікія групкі й пачалі разьмяркоўваць на нач. Мне давялося йзноў трапіць у адну хату з Купалай. Мы меліся начаваць у аднаго настаўніка гімназіі — беларуса. Ён меў кватэру з колькіх пакояў. Быў тут і габінэт, і заля й сталовая й спальня... Усё добра абстаўлянае з дыванамі, абразамі па сьценах. Гаспадары замітусіліся, прыхтавалі гарбату, сухаркі. Гаспадыня вінаватым голасам перапрашала:

— „Даруйце, госьцейкі, цяпер вайна, у нас ужо цяжка што-колечы дастаць". Купала устаў, выйшаў і праз колькі часінаў вярнуўся, паклаўшы на сталe пакунак із булкамі, кілбасой і цукрам, — увесь той запас, які ўдалося наскрэбсьці яму на дарогу цёці Уладзі з „зачыненых распрадзяліцеляў". Гаспадары, ня ведаю, ці шчыра, ці толькі так, для вока, зьдзівіліся. Айзік Кучар, без якога, ведама, не абыйшлася нашая кампанія, з гонарам прамовіў: У нас усё ёсьць! Хутка і ў вас тутка ўсё чыста будзе!"

Пачалася на гэтую тэму даўжэйшая гутарка. Мы распытвалі гаспадароў аб іхным жыцьці, яны пыталіся ў нас аб нашым. Гаспадар прызнаўся, што ён зарабляў каля 400 злотых і што, адлічыўшы ўсё выдаткі на кватэру й пражыцьцё, ў яго заставалася каля 150 злотых у месяц. Грошы гэтыя складаліся, а ў летку яны на іх езьдзілі у горы, ці на мора адпачыць. Мы, як кажуць, і вушы разьвесілі. У нас настаўнікі таксама атрымоўвалі па 400-500 рублёў, але гэтага хапала ім із сям'ёй адно на хлеб ды бульбу.

— „А колькі каштаваў у вас мужчынскі касьцюм"? запытаўся Кучар, аматар добра апранацца. — „Сярэдняе якасьці — каля 70 злотых", адказаў гаспадар. Мы толькі глянулі адзін на аднаго. У нас мужчынскі касьцюм каштаваў ня менш 1000-1500 рублёў. Тут, пабачыўшы нашыя нявыразныя міны, Кучар пачаў ужо хлусіць без ніякага сораму: „У нас таксама кажны працоўны мае ўсё неабходнае. Адкладае грошы, езьдзіць на курорты, ходзіць ледзь не штодня ў тэатры, мае шмат вольнага часу й г. д." Цяпер ужо гаспадары наставілі былі вушы й уважліва заслухаліся ў Кучарову брахню. Мы-ж сядзелі моўчкі. Нам было сорамна глядзець адзін аднаму ў вочы. Выратаваў справу Купала, што, паклаўшы руку на пляче Кучара, прагаварыў тонам, якім гавораць дарослыя да недалеткаў: Ну, годзе, братку, байкі баяць, час і клясьціся". Гаспадыня кінулася слаць ложкі. Нас было шэсьць чалавек і кажнаму з нас знайшлося месца. Спалі гэтую ноч мы на чыстых, сьвежых посьцілках, пад вузорнымі, шоўкам пацягненымі коўдрамі.

(працяг будзе)

»І гарыць вачыма карымі горкі прыпамін«

нібы ён рыхтаваўся забіць галоўнага сакратара ЦК КП(б)Б Гікалу, а першы — будзе растраляны, давёўшы гэтым на самім сабе свае колішнія прароцкія словы з паэмы „Калі асядае муць":

Ходзім мы пад месяцам высокім,
А яшчэ пад ГПУ.

„Дзякуй, Уладзік" — гаворыць Валеры Маракоў, што пазьней звар'яцее ад пакутаў у адным з канцлягероў, а тымчасам піша:

Жыцьцё, як мора-акіян,
А шчасьце — бераг дальні,
Ці як у пустыні караван
Пад гукі песьні пахавальнай.

Вітае Хадыку таксама заўтрашні савецкі катаржнік, экспансыўны й неадрыўны ад паэзіі Юлі Таўбін, што неяк зазначыў пра сабе:

Я з вершам праходжу жыцьцёвыя [тракты,
Я з вершам — і ў крозах і ў сьне...
Харэі і ямбы і пругкія дактылі
Заўсёды на варце ў мяне.

Кульгаючы, ідзе нашанівец Алесь Гурло, якога толькі нечаканая й перадчасная, гэтак падобная да самагубства, сьмерць пазбавіць ад савецкага засьценку. І з абыякавага прэзыдыюму дэманстрацыйна прыўзьнімаецца і абярнуўшыся ў бок Хадыкі, пляскае Янка Купала — жывое сумленьне Беларусі і ейнае гаротнае пісьменьніцкае сям'і.

За ўсім гэтым назіраў відавочна для ўсіх зьбянтэжаны Аляксандровіч. Аднак, гэта не перашкодзіла Бэнду ў наступным слове заўважыць:

— „Возможно гэта і не плохой мастацкій вобраз. Але каму гэтыя молніі пісьмо пісалі? Кулацкім недабіткам. А пра што яны ім пісалі? Пра нянавісьць да савецкае дзяйсьцьвіцельнасьці. Не, таварышы. Савецкая паэзыя долженствует стать нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу, а ў Хадыкі яна нацыянальная і па форме і па зьместу. За такімі кулацкімі молніямі обязательно следуют савецкія громы".

Неўзабаве, калі ня грозны нябесны пярун, што некалі быў у крывічоў богам, дык начны, пагарджаны, энкаведоўскі расейскі гром — „чорны воран" ня мінуў кватэры Уладзімера Хадыкі на Даўгабродзкай вуліцы. Паэта ужо займеў быў сваю сям'ю, што складалася з жонкі й сына. Адначасна ён пакінуў „ТАВІЗ". У асобе свае прывабнае жонкі ён запраўды знайшоў „князёўну дзён сваіх", аб якой не аднойчы марыў у сваіх ранейшых вершах. З маленькім сынам Міхасём на руках яго часта можна было заўважыць у гарадзкім парку. Не стае словаў, каб выказаць гора гэтае вузорнае сям'і. Калі раней жонка Хадыкі часам наведвала Дом Пісьменьніка і цяпер пабегла туды-ж, каб знайсьці там параду, дык дзьверы гэтага будынку перад ёй зачынілі. У дадатак маці з дзіцям высялілі з камунальнага дому, як сваякоў „ворага народу". Высокамастацкія кнігі Хадыкі былі адразу-ж выкіненыя з усіх бібліятэчных паліцаў і зьнішчаныя. Навет самае прыгадваньне ягонага імя сталася небясьпечным.

Невядома дакладна, у чым ворагі нашага народу абвінавачвалі ягонага дарэшты адданага сына Уладзімера Хадыку. Пра гэтае апрача энкаведыстых ведалі толькі сьветкі з боку абвінавачваньня — Бэндэ, Аляксандровіч, Бранштэйн, Клімковіч, Броўка й Кучар. Аднак, адно не падлягае сумніву — ён падзяліў пачэсны, але нявыказна гаротны лёс сотняў тысячаў іншых нязломных беларускіх патрыётаў. Камусьці Масква надала пазьней годнасьць сталінскіх лаўрэатаў, хтосьці начапіў на грудзі ейныя бляшанкі-ардэны, нехта на ейны кошт паехаў да сонечных пляжаў Сочы ды Ялты — Хадыка атрымаў ад яе 10 год катаргі. Перад гэтым бяз малага год паэта адпакутваў у менскай турме. За гэты час Андрэй Аляксандровіч напісаў свой вядомы верш, што канчаўся радкамі:

І я шчасьлівы, бо заўсёды
Шчасьлівы той — хто бальшавік.

— а ягоны байструк, недарэчна мабілізаваны ў літаратуру на зьмену Хадыкам, ударнік Бацюшкаў, шчыра зазначыў:

Ну яго к чорту,
паказваць пачуцьцяў мастацтва,
Лепей вучыцца
валодаць нажом.

І ў той-жа час Хадыка, дарэмна прабуючы пабачыць праз краты „Пішчалінскага замку" хаця-б кавалак роднага неба, хоць вяршаліны родных стромкіх таполяў, чытаў:

Дым адзін ідзе абшарамі
І адзін разьмін.
І гарыць вачыма карымі
Горкі прыпамін.

Узімку 1937-38 г. г. катаржнік Масквы Уладзімер Хадыка пакутуе ў Іванаўскім канцэнтрацыйным лягеры, Новасібірскае акругі. На ім беларускі кажушок з каўнярам. Пасьля нявыказна цяжкое працы, ён забароненым алоўкам на забароненай паперы піша вершы, а потым зашывае іх у каўнер кажушка. Пазьней на кажушку Хадыкі нечакана пачалі зьяўляцца латы. Пад імі, ня ў прыклад тым даламанам, пра якія пісаў раней камсамольскі пісака, ня было дзірак — пад імі таксама хаваліся новыя вершы, што не зьмяшчаліся ўжо ў каўняры. Балюча, што не дайшоў да беларускага народу залатаны кажушок Уладзімера Хадыкі, як дайшоў „Тэстамэнт" іншага пакутніка Уладзімера Жылкі, што пісаў яго затыхаючыся ад перадсьмяротнага сухотнага кашлю. Схаваныя ў ім, бяз сумніву, выдатныя вершы, назаўсёды загінулі для народу, як гіне яшчэ ненароджанае дзіцянё разам із сьмерцю маткі. Яшчэ больш павялічыліся сумныя рысы у кутках вуснаў паэты. Ён часта прыгадваў сваю сям'ю і, асабліва, сына. Можа ён прадчуваў, што яе, бязьлітасна падбітую камуністымі, потым замардуюць фашыстыя. Часам пры гэтых прыпамінах з ягоных грудзей вырываўся прыдушаны стогн, чуўся скрыгат зубоў і яшчэ галасьней, чымся калісьці, хрусьцелі схудзелыя пальцы. Нарэшце ад яго пачулі:

— Трэба хутчэй прыдумаць які-небудзь канец.

Ёсьць у тым праклятым Сібіру вялікі сьцюдзёны Байкал. З усіх бакоў абкружылі яго напоўголыя дзікія горы. Падрываючы гэтыя горы, савецкія катаржнікі пракладалі менавіта тую патрэбную Маскве чыгунку, пра якую Тодар Лебяда пісаў:

Амаль пад кажнай шпалай
Ляжыць замучаны
У выгнаньні беларус.

12 травеня 1940 г. падарваны аскепак скалы абваліўся й раздушыў пад сабой аднаго савецкага катаржніка з бліжэйшага канцэнтрацыйнага лягеру. Хто ведае — можа ён сьвядома на колькі лічаных часінаў затрымаўся, замест таго, каб адскочыць убок. Сябры пахавалі яго ў тым-жа кажушку, паставіўшы на магіле крыж і напісаўшы на ім алоўкам:

Уладзімер Хадыка

Дарагі, ніколі незабыўны сябру, прымі ад адданага табе да скону свайго жыцьця сябры гэты сьціплы вянок. Можа нястала ў ім адпаведных кветкаў, каб пераказаць усю тваю нязвычайнасьць, але за тое ён зьвязаны ім ад шчырага сэрца. Тая скала, аскепак якое раздушыў цябе, тымчасам, дагэтуль ляжыць на магутных грудзёх твайго народу, якім ты жыў і за які загінуў.

Юрка Віцьбіч.

14. 7. 52.
ЗША

Найвялікшае рабаваньне Беларусі

(Канец з 2 бал.)

цебску вырабляюць усе патрэбныя дэталі гатовых дамоў — сьцены, дахі, сьлегі, дастаўляюць гатовы матар'ял ў адпаведнае месца, змантоўваюць і перадаюць гатовыя дамы да карыстаньня. Гэтыя стандартныя будынкі даволі вялікія — двохпаверхавыя на шаснаццаць кватэраў. Перавозка і змантаваньне будынкаў таксама выконваецца беларускімі майстрамі, якіх такім парадкам расьцярушваюць па далёкіх абшарах СССР.

У той час, калі на Беларусі — зруйнаванай вайною людзі ня маюць хатаў, нашае дрэва ідзе ня толькі на пабудову гэтых Кахоўкаў і Донбасаў, але і да Варшавы. Вось маленькая даведка:

„Віцебск, 12.V (БЕЛТА). „З вялікім натхненьнем працуе калектыў домабудаўнічага камбінату для выканьньня заказу будаўнікоў Варшаўскага палацу культуры і навукі. 10 мая домабудаўнікі **адгрузілі** польскім сябром **новую партыю стандартных дамоў.** Спаборнічаюць за датэрміновае выкананьне **ўсяго** ганаровага заказу, калектыў прадпрыемства рашыў **вырабіць** у маі **яшчэ дзесяць шаснаццацёхкватэрных дамоў"** (Звязда, № 112 за 13 мая 1952 г.).

Апрача дрэва рабуюць у нас і шмат чаго яшчэ. Аб гэтым ізноў сьветчаць ізвесткі БелТА.

„Новая Кахоўка, 17.V. — Сюды з **Нараўлі** (Беларуская ССР) прыбылі дзьве **плывучыя брандвахты** на 16 кают кажная. Яны пабудаваныя калектывам **Нараўлянскай Судаверфі** для каманд земснарадаў вялікай будоўлі на Дняпры. Апрача жылых кают, кажная брандвахта мае сталовую з кухняй, пральню, ванны пакой і іншыя службовыя памешканьні..." (Звязда, № 143 за 18.VI). „Мазыр, 14.VI (БелТА). **З Мазыра** ўніз па Прыпяці дыйшоў грузавы параход „Менск". **Ен буксіруе вялікагрузныя плыты лесу, прызначаныя для будаўніцтва Кахоўскай Гэс. На шляху у Кахоўку** ў сучасны момант знаходзяцца таксама параходы „Важаты", „Вадап'янаў" і „Парыская камуна"... з матар'яламі для вялікіх будоўляў камунізму ад працоўных Беларусі..." (Звязда, № 141 за 15.VI. 1952).

І на заканчэньне гэтага разьдзелу яшчэ адна вытрымка: „Добруш, 27.V. Папяровы камбінат „Гэрой працы" — адно з буйнейшых прадпрыемстваў рэспублікі — датармінова выконвае ганаровыя заказы вялікіх будоўляў і іншых установаў нашае Вялікае Радзімы. Штодзень **высокаякасная папера адгружаецца адсюль** на фабрыкі **Масквы, Ленінграду, Кіеву.** Зараз выконваецца заказы маскоўскай фабрыкі „Саюз" і Ленінградскай фабрыкі тэхнічнай паперы. Для іх **адгружана сьветаадчувальная папера..."** (Звязда, № 125, за 28.V. 1952).

Але гэтаю галіною прамысловасьці нашага краю маскоўскі-бальшавіцкі акупант не задавальняецца і цягне да сябе ўсё, што выраблююць іншыя галіны нашае прамысловасьці.

Машынавая прамысловасьць

Беларусь, як мы добра ведаем, ня мае ніякіх перадумоваў для разьвіцьця зялезнае прамысловасьці, ня мае шахтаў дзеля здабыцьця зялезнае руды, хоць залежы яе мае. Няма ў нас і вугальля для неабходнага прамысловасьці. Аднак, пасьля вайны машынавая прамысловасьць у краі была наладжаная. Найвялікшае з гэткіх прадпрыемстваў — Менскі аўтамабільны завод, які пасьля вайны значна пашыраны і разбудаваны. Гэты завод цяпер проста перагружаны працаю для „вялікіх будоўляў", падае „Звязда":

Ганаровы заказ выкананы датармінова

Калектыў Менскага аўтамабільнага заводу пасьпяхова спаборнічае за датэрміновае выкананьне заказаў вялікіх будоўляў камунізму.

У цэху цяжкіх машын Менскага аўтамабільнага заводу ідзе зборка апошніх вузлоў некалькіх 25-тонных самазвалаў. Гэтым завод заканчвае выкананьне гадавога пляну адгрузкі машынаў „МАЗ — 525", прызначаных для будаўнікаў Куйбышаўскай ГЭС. Крыху раней тэрміну выкананы гадавы заказ „Сталінградгідрабуду"... ...Аўтамабільны завод выканаў таксама гадавы плян пастаўкі самазвалаў „МАЗ — 205" для Туркменскага каналу..." („Звязда", № 156 за 3.VII 1952).

Але ня толькі самазвалы й цяжкія машыны бязупынна струменяць з Беларусі. Працуюць на акупантаў і ўсе іншыя прадпрыемствы зялезная прамысловасьці Беларусі. Віцебскі завод заточных станкоў працуе на тыя-ж будоўлі дзеля падбіцьця сьвету крамлёўскімі тыранамі: **„Віцебск.** Калектыў Віцебскага заводу заточных станкоў... прыступіў да выпуску **чарговай партыі станкоў** для **будаўніцтва Куйбышаўскай ГЭС... Гэтымі днямі станкабудаўнікі адгрузілі **партыю станкоў** для будаўнікоў Кахоўскай гідраэлектрастанцыі... (Звязда, № 148 за 24.VI. 1952).

Тое самае — усюдых. Ідуць на Волгу й Дон гэтак неабходныя для зруйнаванае гаспадаркі Беларусі электраматоры Магілеўскага мэталяапрацоўчага камбінату, заводу „Строммашына", які выробляе розныя далікатныя машыны й апараты, працуе на іх гомельскі „Сельмаш" і г. д.

Ідзе туды й вопратка: „Нядаўна з Віцебску **адпраўлена вялікая партыя зімовай вопраткі** для будаўнікоў Куйбышаўскай ГЭС і Волга-Донскага каналу. Заказы вялікіх будоўляў выконваюцца... датармінова", піша „Звязда". № 68 за 20.III. 52). Беларускія сяляне жывуць у зямлянках ці ў цёмных будынінах без вакон, а шкло ідзе: „для вялікіх будоўляў камунізму". ...„Нядаўна гомельскі шклозавод атрымаў заказ на выраб вітрыннага шкла для Сталінградзкай гідраэлектрастанцыі, Паўдзённа - Украінскага й Паўночна-Крымскага каналу, падае савецкая прэса. ...„Першыя партыі буйнога барытнага шкла для сталінскіх будоўляў выпушчаны датэрмінова..." (Зьвязда, № 72 за 25.III 52).

Высылаецца туды й цэгла з беларускіх цагельняў, якая прызначалася для калгаснага будаўніцтва ўсіх разбураных вайною акругаў БССР ад Полацку да Мазыру, ад Магілева да Горадні.

У цэнтрах вялікага будаўніцтва, ўрэшце, тысячамі працуюць і гінуць нашыя майстры й працоўныя, вывезеныя з бацькаўшчыны. Бо рабаваць багацьці нашага краю для Масквы мала. Ян спрытна выкарыстоўвае й нашыя жывыя народныя сілы. І новыя „вялікія пабудовы камунізму" — дзе на касьцёх паняволеных маскоўска-бальшавіцкімі гвалтаўнікамі народаў ССР будуецца чырвоны маскоўскі імпэрыялізм, — сталіся ужо магілаю сотняў тысячаў абрабаваных, ашуканых, замучаных людзей — косьць ад касьці й кроў ад крыві нашага народу.

М. Кургановіч


З жыцьця Беларускае Скауцкае Групы у Нью-Ерку

Скаўты, згуртаваныя ў Беларускай Скаўцкай Групе Нью-Ёрку, выяжджалі кагадзе ў Скаўцкі лягер і прабылі там на працягу 5-цёх дзён.

Ледзь пачалі сонечныя праменьні прабівацца з за будынкаў ды дрэваў старога Брукліну, а ўжо ў „Беларускую хатку" адзін па адным пачалі зьбірацца нашыя скаўты, каб накіравацца ў лягер, аб якім яны даўно ўжо марылі. Вясёлыя твары хлапцоў зраджалі іхнюю радасьць, усхваляванасьць, а таксама скаўцкую спасьцярагальнасьць і разуменьне павагі свае ролі. Хутка — усе былі на месцы й група, пад кіраўніцтвам скаўтмайстры сп. М. Тулейкі памашыравала на станцыю. Апрача асабістых рэчаў, хлапцы цягнулі палаткі, катлы, сякеры, спартовыя прылады, нагрузіўшыся да апошняга, але ніхто не наракаў. Каля паўдня група была на месцы. Густы лес, парэзаны сьцежкамі-дарожкамі, прыгожыя палянкі, басэйн для плаваньня — спадабаліся ўсім. Воддалі узвышаліся нявысокія, парослыя лесам горы. Адпачыўшы, нашыя скаўты адразу ўзяліся за працу. Адны расстаўлялі палаткі, іншыя варылі страву, бо ведама-ж, скаўты на нястачу апэтыту ніколі ня скардзяцца, яшчэ іншыя рабілі парадак навокал. Пакуль пачало цямнець — усё было гатовае. Узьняцьце беларускага бел-чырвона-белага й скаўцкага сьцягоў паклала пачатак лягернаму жыцьцю.

Лягер пачаўся.

Дзень па дні мінаў хутка у працы, скаўцкіх практыкаваньнях і гульнях. Праграма кажнага дня была так укладзеная, што за пяць дзён скаўты добра пазнаёміліся із лягернымі парадкамі, шмат чаго навучыліся з галіны скаўцкіх ведаў, а таксама набылі новыя спраўнасьці: выдатна паказалі сябе ў плаваньні, навязалі лучнасьць із Скаўтамі іншых групаў, некаторыя авансавалі да вышэйшае ступені, а галоўнае, — запраўды пачуліся скаўтамі. Колькі ўцехі мелі яны ў гульнях, спаборніцтвах, у супольным спажываньні найсмачнейшай, бо собскімі рукамі прыгатаванай ежы, колькі усхваляваных часінаў перажылі пры скаўцкім вогнішчы ці урачыстай скаўцкай вячорная малітве! І хоць трываў лягер усяго 5 дзён, — незабыўныя уражаньні нязвычайнага жыцьця ў аблічы прыроды засталіся надоўга ў памяці кажнага.



Група нашых скаўтаў у лягеры.

Лягернае скаўцкае жыцьцё мае вялізарную узгадавальную вартасьць. Маладыя хлапцы, адарваныя ад хаты й бацькоў, што часта-густа распешчваюць іх, дагаджачы дзецям, за што гэтыя апошнія ня менш часта плацяць ім капрысамі і няўдзячнасьцяй, — у лягеры без пратэстаў датарноўваюцца да агульнага парадку, праяўляючы шмат самастойнасьці й зараднасьці ў кажнай праяве жыцьця. Паслухманасьць сваім кіраўнікам, сяброўства, парадак навонкі і ўнутры — хутка пасьцігаюцца ўсімі. З іншага боку прырода, ад якое бальшыня нашае эміграцыі так далёкая сяньня, — важкі дзейнік у ўзгадаваньні чалавека, — мае тут вялікі ўплыў на душу юнака, што асабліва назіраецца на адзінках, якія растуць і гадуюцца у ўмовах вялікіх местаў.

Але ў кароткай справаздачы нельга затрымоўвацца над гэтым даўжэй. Трэба адно сказаць, што арганізуючы скаўцкія групы ў большых асяродзьзях згуртаваньня нашае эміграцыі, — можна ўдала узьдзейнічаць на нашую моладзь, што пачынае падрастаць і на якую, на жаль, мала дзе зьвяртаецца належная ўвага.

Пяць дзён мінулі і
лягер скончыўся.

У дзіўным настроі вярталася скаўцкая група у Нью-Ёрк. Кажны думаў адно: — „як хутка усё скончылася"!

І скаўтмайстра мусіў нязьлічаную колькасьць раз адказваць на нецярплівае запытаньне хлапцоў: „Калі-ж мы зноў паедзем у лягер"?

М. Т.

ЗАКЛІК

ДА БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДЗТВА НА ЧУЖЫНЕ.

Сёлета прыпадаюць 90-ыя ўгодкі беларускае прэсы — спаўняецца 90 год ад часу выхаду ў сьвет першае беларускае газэты „Мужыцкая Праўда", выдаванае нацыянальным героям нашага народу Кастусём Каліноўскім. Нашым абавязкам — належна адзначыць гэтую важкую і слаўную гадавіну. Дзеля гэтага Саюз Беларускіх Журналістых у паразуменьні з усімі іншымі беларускімі навуковымі інстытуцыямі ды грамадзкімі арганізацыямі рыхтуецца на пачатку восені сёлета да наладжаньня адмысловага сьвята беларускае прэсы й выстаўкі беларускага друку.

Абавязкам кажнага беларуса — дапамагчы выстаўцы, хто чым можа, каб яна запраўды мела ўдачу й сярод сваіх, і сярод чужынцаў, што яшчэ ўсьцяж так мала ведаюць аб нас і нашай справе.

Дзеля гэтага, зьвяртаемся да ўсіх беларускіх арганізацыяў сьвету й кажнага беларуса ў асобнасьці із гарачаю просьбаю дапамагчы сваймі зборамі ды архівамі справе наладжаньня выстаўкі. Усе прысланыя матар'ялы, як кніжкі, брашуры, часапісы, газэты як сучасныя, так і даўнейшыя й г. д. будуць зьвернёныя собсьнікам пасьля выстаўкі у найлепшым парадку.

Матар'ялы, заўвагі, пытаньні й г. д. просім слаць на адрыс Саюзу Беларускіх Журналістых: М. Панькоў,

Vandervoort Place, Brooklyn, N. Y. USA.

—о—

АБВЕСТКА

Аддзел Згуртаваньня Беларускае Моладзі у Нью-Ёрку ладзіць 6-га верасьня сёлета экскурсыю на возера „Greenwood Lake", якое ляжыць у вельмі прыгожай мясцовасьці каля 50 міляў ад Нью-Ёрку.

Экскурсыя прадбачыць гульні, спаборніцтвы, купаньне, сьпяваньне песняў і шмат іншых вясёлых неспадзекаў.

Хто зажадае, — будзе мець магчымасьць пераначаваць над возерам.

Аб сваім жаданьні ўзяць удзел у экскурсыі трэба паведаміць Урад ЗБМ не пазьней 30 жніўня г. г. Паведамленьні просім кіраваць на адрыс:

M. Zamorski, 1325 Eastern Parkway, Brooklyn. N. Y.

Усім удзельнікам экскурсыі загадзя будзе пасланае дакладнае паведамленьне аб коштах экскурсыі, месцы й часе зборкі і г. п.

Урад Аддзелу ЗБМ у Нью-Ёрку.